eurozine

**Nelly Bekus−Goncharova**

# Сэнс вопраткі на грамадзкай тэрыторыі

> Ісьціна − далёка ня самая зручная рэч для жыцьця ў грамадзтве, прывабнае аблічча каштуе тут нашмат болей, амаль як у жывапісе...
>
> Імануэль Кант

Гэты тэкст прысьвечаны вопратцы як спэцыфічнай сацыяльнай функцыі ў жыцьці чалавека. У самой прыродзе вопраткі ёсьць штосьці ад буфэру, яе знакава−візуальны складнік зьмякчае й запавольвае стасункі з асяродзьдзем. Вось і ў прымаўках, накшталт "Не апратка здобіць чалавека..." ці "Не глядзі, што на галаве...", адлюстроўваецца гэтая яе сутнасьць, якая выяўляецца ў стварэньні асаблівай прасторы для камунікацыйных манэўраў. За ёй, вопраткай, можна схавацца ў натоўпе, а можна, наадварот, пры дапамозе вопраткі апынуцца ў цэнтры ўвагі.

Нягледзячы на гэтую відавочную сацыяльную функцыянальнасьць вопраткі, нельга сказаць, што грамадзтва цалкам вызначае форму ці стыль таго, што людзі носяць. Хаця і зусім свабодным ад макракантролю ў гэтай галіне чалавека не назавеш. Тут існуе пэўны "канвэнцыянальны зазор", які дазваляе ператварыць адносіны абодвух бакоў ува ўзаемадзеяньне. У гэтым зазоры адліваецца і фармуецца своеасаблівы кіроўны прынцып, які і вызначае індывідуальныя "вопраткавыя паводзіны" чалавека ў сацыяльным асяродзьдзі. Прынцып гэты − вытворная многіх складнікаў: тут і культура з нацыянальнай традыцыяй, і грамадзкая сыстэма з ідэалёгіяй, і асабовыя арыенціры ў шматвэктарным полі сучаснасьці, і, без сумневу, мода. Насуперак усім эфэктам глябалізацыі, якіх безьліч на паверхні жыцьця, і сёньня ўсё яшчэ адчуваецца розьніца паміж краінамі ў манеры апранацца. Хаця адрозьненьняў становіцца ўсё меней, а рысы ўнутрынацыянальнага адзінства ўсё танчэюць. Але некаторыя межы на тэрыторыі вопраткі працягваюць функцыянаваць. Працуе, прыкладам, мяжа, якая аддзяляе тэрыторыі "пасьля сацыялізму" ад заходніх. Гэта й ня дзіва. Практычна ўвесь досьвед вопраткі па розныя бакі гэтай мяжы заўсёды адрозьніваўся на ўсіх узроўнях, ад яе вытворчасьці і да набыцьця і стаўленьня да рэчаў падчас нашэньня. Як лёгка заўсёды счытваліся савецкія турысты за мяжой, так і замежнікі ў нашай краіне заўсёды і беспамылкова адгадваліся. Практыка вопраткі гаварыла сама за сябе.

Відавочна, што за гэтай звонку даволі будзённай тэмай вопраткі праглядаецца куды больш глыбокая праблематыка − гэта і стратэгія прэзэнтацыі чалавека ў соцыюме, і статус цела ў сыстэме сацыяльных адносін, і праблема сэміятычных кодаў у вопратцы, і за ёй − у грамадзкіх месцах.

Сёньня сацлягеру больш не існуе, Эўропа аб'ядноўваецца, дзяржаўныя межы, там, дзе яны захавалі свае функцыі, усё часьцей перасякаюцца ў абодвух кірунках. Аднак розны досьвед вопраткі ў жыцьці людзей працягвае адлюстроўвацца. Ён тым больш відавочны ў Беларусі, якую наведвае няшмат замежнікаў і грамадзяне якой нячаста выяжджаюць за мяжу. Усё гэта спрыяе гермэтызацыі мінулага досьведу ў межах асобнага грамадзтва і падаўжэньню, пакуль на няпэўны тэрмін, яго паўнамоцтваў.

Адным з наступстваў гэтай беларускай спэцыфікі зьяўляецца зьдзіўленьне, якое нязьменна выклікае ў замежнікаў выгляд людзей на беларускіх вуліцах. Зьдзіўленьне гэтае ёсьць настолькі сталай формай рэакцыі на знаёмства з нашай рэальнасьцю, што міжволі закрадаецца падозраньне, што мы маем справу зь нейкім асаблівым эфэктам, які ўзьнікае пры трапленьні чужога позірку на гэты "верхні" слой нашай будзённасьці і які не праглядаецца нашай уласнай, хатняй оптыкай. Што канкрэтна тут адбываецца, можна паспрабаваць зразумець, калі скарыстацца на нейкі час гэтым чужым поглядам.

За мяжой ведаюць пра цяжкую спадчыну сацыялізму, пра сёньняшнія эканамічныя цяжкасьці, пра сацыяльную неўладкаванасьць і нізкія даходы – пра ўсё тое, што заўсёды розьніла сацлягер ад Захаду, а сёньня – Беларусь ад постсацыялістычных краінаў Цэнтральнай Эўропы. Па прыезьдзе сюды замежнік чакае пабачыць карціну, рэлевантную гэтаму веданьню, якая грунтоўна падтрымліваецца статыстыкай і аналітычнымі матэрыяламі на старонках нашага і заходняга друку. Яны, прыкладам, могуць ведаць, што, паводле зьвестак Міністэрства статыстыкі і аналізу, летам 2002 году сярэдні заробак у Беларусі складаў 183 735 рублёў. І нікому не падаецца дзіўным, што, паводле апытаньня ў студзені 2003 году, 51% рэспандэнтаў прызналі, што вымушаны адмаўляць сабе ў самых неабходных рэчах, што 61% часта не маглі дазволіць сабе набыць вопратку, 44% адмаўляліся ад мэдыкамэнтаў. І толькі 30% рэдка не маглі дазволіць сабе набыць вопратку, і толькі 9% ніколі не сутыкаліся з падобнымі цяжкасьцямі [1].

Аднак карціна нашых вуліц аніяк не падтрымлівае гэтага веданьня, хутчэй, наадварот, увачавідкі супярэчыць. Свае эмоцыі людзі з розных краін выказваюць па–рознаму. Ад "як добра беларускія жанчыны апранутыя", "як шмат "жаноцкасьці" ў абліччы беларускіх жанчын, што даўно страчана на Захадзе", да "як вульгарна і крыкліва карыстаюцца касмэтыкай вашыя жанчыны", "у нас міні–спадніцы ў спалучэньні з высокім абцасам – першая прыкмета жанчыны лёгкіх паводзінаў, а тут...". У кожным з гэтых розных, а то і інтанацыйна супрацьлеглых водгукаў лёгка знайсьці сьляды аднаго й таго ж сындрому – нейкай відавочнай неадэкватнасьці, якая ставіць у тупік недасьведчанага ў нашай рэальнасьці замежніка. Варта адзначыць, аднак, што неадэкватнасьць гэтая мае і адваротны бок – "нашы" людзі па прыезьдзе з–за мяжы таксама маюць падобныя ўражаньні аб "дзіўнасьці" выгляду людзей на іхных вуліцах. Пра занадта проста і нецікава апранутых жанчын, пра адсутнасьць у іх інтарэсу да моды, касмэтыкі, упрыгожаньняў і г.д.

Відавочная супярэчнасьць паміж рэальным станам справаў у краіне, зьвесткамі статыстыкі, зьмесьцівам вітрын беларускіх крамаў і абліччам людзей становіцца галоўнай крыніцай зьдзіўленьня замежнікаў. "Аранжыроўка", якая выбіраецца людзьмі для зьяўленьня ў грамадзкіх месцах – у крамах, на пошце, садках, – уваходзіць у канфлікт з схаванай за гэтым выглядам рэальнасьцю. Прасьцей кажучы, колькасьць

натуральных футраў на беларускіх вуліцах не ўкладаецца ў рамкі фінансавых абмежаваньняў, якімі беларуская эканамічная сыстэма апярэзвае беларускую рэчаіснасьць.

Выгляд людзей упарта стварае ўражаньне пра краіну, шмат у якіх аспэктах квітнеючую. Але ёсьць і другі аспэкт неадэкватнасьці, зь якім маюць справу замежнікі, што завіталі ў Беларусь, − гэта своеасаблівая стылістычная дэканструкцыя, якую зьдзяйсьняюць нашыя жанчыны над вопраткай у сваёй будзённасьці. Для сваіх будзённых заняткаў яны часьцяком выбіраюць тыя стылістычныя абароты, якія адмаўляюць сабой будзённасьць: тут і абутак на высокім абцасе, і сукенкі a la вячэрнія, і ўпрыгожаньні, і інтэнсіўны макіяж. Такі стылістычны трэнд на Захадзе, як правіла, ёсьць азнакаю "асаблівага выпадку", дзеля якога ён выкарыстоўваецца. Тут жа, зь зьдзіўленьнем даведваюцца іншаземцы, такі выгляд можа быць прызначаны для простага выхаду на вуліцу. Нікому з нас не здаецца дзіўным выгляд маладой жанчыны, апранутай як на вячэрні прыём, якая робіць закупы ў найбліжэйшым унівэрсаме. Гэта моцна ўражвае замежнікаў, у сьвядомасьці якіх існуе строга ранжаванае ўяўленьне пра вопратку, у якой усё, нават неахайнасьць, займае спэцыяльна вылучанае месца.

Падобнае заціраньне межаў і функцыяў, замацаваных за рознымі прадметамі туалету, у строях людзей на беларускіх вуліцах становіцца своеасаблівым маскаваньнем сацыяльнай праўды. Відавочна, што стварэньне такога "характэрнага" аблічча, якое суправаджае нашых людзей у грамадзкіх месцах, патрабуе ад іх спэцыяльных высілкаў. Сытуацыя нечым нагадвае касмэтычную апэрацыю на тканках будзённасьці, у выніку якой кожны чалавек пачынае здавацца ці то некім іншым, ці то самім сабой, але не на сваім месцы. А вуліцы, поўныя добра апранутых людзей, пачынаюць успрымацца асаблівым псыхасацыяльным фэномэнам тутэйшага жыцьця.

Агульны сэнс падобнага выгляду можна вызначыць − і менавіта так ён і прачытваецца замежнікамі − як пэрфарматыўную дэклярацыю росквіту і дастатку, пасьпяховага сацыяльнага лёсу і недасягальнага (можа быць, у рэальнасьці) багацьця. Усе разам здаюцца схаванымі за калектыўнай маскай, на якую нанесены занадта тоўсты слой залішняй рэпрэзэнтацыі. І калі пагадзіцца зь цьверджаньнем сацыёляга Фіна Колінза, што "вопратка стварае камэнтары да бягучых сацыяльных падзеяў, узмацняе і разьвівае адрозныя рысы сацыяльнага жыцьця", то і гэты сымбалічны камуфляж на беларускіх вуліцах можна прачытаць як своеасаблівы камэнтар да рэчаіснасьці. Зразумела, што "элегантныя строі" ў беларускіх грамадзкіх месцах ня маюць аніякай простай сэміятычнай канатацыі. За лёгікай простага прыкрыцьця праўды жыцьця можна выявіць складаную сыстэму ўзаемадзеяньня між рознымі бакамі сацыяльнай камунікацыі.

Заўважым, што асобныя элемэнты стыляў вопраткі, якія выкарыстоўваюцца беларускімі жанчынамі, не зьяўляюцца прадуктамі ўласна беларускай рэчаіснасьці і ёсьць артэфактамі зусім іншага сымбалічнага кшталту. І таму тое, што мы назіраем, не зьяўляецца стварэньнем нечага якасна новага зь нічога, але дасягаецца шляхам трансфармацыі і рэарганізацыі элемэнтаў, запазычаных і прыўнесеных у новы кантэкст. Элемэнты існых стыляў інсталююцца ў новую канфігурацыю грамадзкай прасторы. У тым, як і чаму гэта адбываецца, можна паспрабаваць разабрацца.

Не сакрэт, што ў сацыялістычным мінулым каштоўнасьць вопраткі фармавалася ідэямі практычнасьці і функцыянальнасьці. Фактычна, у вызначэньні выгляду людзей тады пераважала простая лёгіка неабходнасьці і нават патрэбы. Апрача таго, любая асаблівая ўвага да вопраткі, інакшы вонкавы выгляд некаторых людзей імгненна ўводзіў іх у "сыстэмны канфлікт" з кіроўным прынцыпам, паводле якога ўсе магчымыя адрозьненьні ў грамадстве павінны быць сьцертыя. Афіцыйна абвешчаная ідэя татальнай сацыяльнай роўнасьці абарочвалася прынцыповай гамагеннасьцю поля сымбалічнай рэпрэзэнтацыі, сфармаванай сацыялістычнай ідэалёгіяй. Яна забараняла любую бачную дэманстрацыю свайго "адрозьненьня" ў сацыяльным жыцьці і грамадзкіх месцах. Да гэтага ідэалягічнага партрэту можна дадаць памятную ўсімі перавагу грамадзкіх інтарэсаў над асабістымі. Усялякая гіпатэтычная цікавасьць да вопраткі імгненна тлумачылася намеранай экспазыцыяй "асабістага", што ня ўпісвалася ў агульны дызайн сацыяльнай прасторы. Натуральна, што адрозьненьні паміж слаямі грамадства існавалі, і яны таксама натуральна суправаджаліся разнастайнасьцю стыляў грамадзкай самапрэзэнтацыі. Але з прычыны таго, што гэта ніяк не адлюстроўвалася ў ідэалёгіі сацыяльнай сыстэмы, адрозьненьні гэтыя ня склаліся ў празрыстую "мову" вопраткі і засталіся на ўзроўні спантанных і стыхійных экспрэсій.

Становішча пачало мяняцца ў часы позьняга сацыялізму, калі асобныя атрыбуты заходняга стандарту жыцьця пачалі праточвацца ў сацыялістычнае грамадства і нанасіць асаблівыя значкі на візуальную манатоннасьць сацыялістычнай рэчаіснасьці. Аднак і гэтыя асобныя прадметы, ізаляваныя ад свайго арыгінальнага сымбалічнага і сацыяльнага кантэксту, не былі здольныя сфармуляваць хоць якое рэлевантнае "паведамленьне" на сваёй мове. Тое, што яны казалі, зводзілася, па сутнасьці, да паведамленьня пра сваё заходняе паходжаньне, і гэтым абмяжоўвалася. Да таго ж гэтыя рэчы з Захаду, як правіла, траплялі "на людзі" праз чорны рынак, які быў нечым накшталт паралельнай культуры. Ён суіснаваў з афіцыйнай сфэрай і ня меў на яе асаблівага ўплыву. Па сутнасьці, абмежаваныя рамкамі "культуры чорнага рынку", гэтыя рэчы з Захаду не былі здольныя ні "зрушыць", ні расхістаць ідэалягічную канструкцыю, якая, паводле палітоляга Аляксея Юрчака, функцыянавала як гегемонія рэпрэзэнтацыі. У сваім артыкуле "Цынічныя прычыны позьняга сацыялізму" Юрчак пісаў, што ў той пэрыяд ідэалягічныя пасланьні былі элемэнтамі ўсёабдымнай паноўнай рэпрэзэнтацыі, і хаця яны ўжо даўно перасталі разумецца літаральна, але па–ранейшаму ўспрымаліся як непазьбежныя і паўсюдныя. Гэты бясспрэчны характар дзейных законаў сацыяльнага сьвету быў упісаны ў асабісты досьвед савецкіх грамадзян. Яны ўсьведамлялі поўны кантроль улады над усімі мэханізмамі рэпрэзэнтацыі. У гэтай сытуацыі афіцыйная рэчаіснасьць мела абсалютны і "неадменны" характар не таму, што лічылася сапраўднай, і нават не таму, што людзі баяліся ёй што–небудзь супрацьставіць, але менавіта таму, што ніякай іншай формы грамадзкай рэпрэзэнтацыі рэчаіснасьці ў афіцыйнай сфэры не было і зьявіцца не магло. Сыстэма гэтая цалкам ахоплівала такія сфэры жыцьця, як вопратка, кватэры, мэбля, і ніколі яшчэ не апыналася пад знакам сумневу на ўзроўні ідэалёгіі. Таму і тыя асобныя элемэнты заходняй вопраткі, трапляючы ў савецкае грамадства, аказваліся ў ролі ўсяго толькі чужых, хаця і прывабных, парушальнікаў ідэалягічных межаў.

Для сацыялістычнага ладу грамадзкай сыстэмы была вельмі важнай мяжа, якая праходзіла дакладна ўздоўж рысы судакрананьня вопраткі з

чалавечым целам: па розныя бакі гэтай мяжы знаходзіліся тэрыторыі, падкантрольныя розным інстанцыям. Вопратка была цалкам падначалена ідэалёгіі, у той час як цела было агентам прыватнага, асабістага жыцьця (ня як у Маклюэна, для якога вопратка – працяг скуры).

З гэтай кароткай перадгісторыі беларускай сучаснасьці зразумела, што ідэалягічны масіў, які доўгія гады панаваў на гэтай тэрыторыі, зрабіў немагчымым узьнікненьне якіх–кольвек уласных уцямных сэміятычных кодаў вопраткі, параўнальных з тымі, што разьвіліся ў заходніх краінах. Не было таксама і рэзкага пераходу ў іншую сацыяльную сыстэму, як у краінах Усходняй і Цэнтральнай Эўропы, пры якім адбылася таксама поўная замена ідэалёгіі і практыкі вопраткі. Разам зь фірмовымі буцікамі вядомых сусьветных вытворцаў на вуліцы Прагі, Будапэшту, Варшавы прыйшлі новыя формы сацыяльнай рэпрэзэнтацыі, строга ранжаваныя ў стылі, статусе, месцы. Нічога падобнага не было ў Беларусі. У выніку паступовага і стыхійнага зьяўленьня ў нашай вопратцы ідэалягічных дадаткаў і дамешкаў з Захаду, часьцей за ўсё апасродкаваных трэцімі краінамі, узьнікла новая канфігурацыя гэтай сэміятычнай прасторы, у якой можна знайсьці абрыўкі розных стыляў, наборы, складзеныя з фрагмэнтаў чужой мовы вопраткі, сымбаляў, узятых зь іншых сыстэм і кантэкстаў. Разам з "прадметамі туалету", натуральна, трансьлююцца і сымбалічныя значэньні, але яны ўжо зусім іначай функцыянуюць у новым кантэксьце. Адпаведна, і для расшыфроўкі такіх тэкстаў патрэбна асобная граматыка, якая ўлічвала б гэты трансфэр значэньняў і будавалася б на перакрыжаваным узаемадзеяньні арыгінальнага сымбалічнага парадку і той галіны "беларускага рэальнага", куды яны перасунуліся.

Тое, што адкрываецца погляду на беларускіх вуліцах, – гэта своеасаблівая гульня прадметамі туалету, якая разгортваецца не на адным, а адразу на некалькіх сымбалічных палёх, і гэты стан суіснаваньня дрэс–кодаў у беларускіх грамадзкіх месцах і становіцца крыніцай неразуменьня, неадэкватнай інтэрпрэтацыі іх зьместаў. Замежнікі – навабранцы нашай будзённасьці – проста ня могуць зразумець паведамленьне, якое трансьлітаравана ў новы кантэкст без уліку старых значэньняў.

Тое, што аранжыроўка свайго зьяўленьня ў грамадзкім месцы зьяўляецца своеасаблівым сацыяльным дзеяньнем, сацыёлягі давялі даўно. У гэтым былі згодныя нават самыя зацятыя антаганісты – ад структуралістаў і канструктывістаў, што ставяць на аб'ектыўны зьмест у нашых паводзінах, да філёзафаў суб'екта, якія бачаць ува ўсім спантаннасьць, якая ідзе з глыбінь суб'ектыўнасьці. Аднак ні адны, ні другія не маглі пазьбегчы сваёй крайнасьці ўва ўзнаўленьні лёгікі, якая кіруе сацыяльнымі паводзінамі чалавека і ягонай манерай апранацца. Той самай лёгікі, якая актуалізуецца, калі чалавек падыходзіць да свайго гардэробу і выбірае, у чым сёньня зьявіцца на людзях. Каб пазьбегчы крайнасьцяў і вывесьці сынтэтычную формулу, у якой былі б адначасова і "насьледаваньне аб'ектыўным сацыяльным правілам", і цяжкавыразны элемэнт унутранага суб'ектыўнага разуменьня, францускі сацыёляг Бурд'ё ўвёў у сацыяльную тэорыю панятак "habitus". Habitus быў для яго катэгорыяй, здольнай унесьці стратэгічную раўнавагу ў апісаньне чалавечых дзеяньняў у сацыяльнай прасторы. Habitus – гэта сыстэма дыспазыцыяў, якая ўлучае рэальны прынцып, схаваны ў стратэгіі практычны сэнс, тое, што спартоўцы называюць пачуцьцем гульні, такое сабе своеасаблівае валоданьне лёгікай, непадкантрольнае сьвядомасьці і дыскурсу.

Панятак "habitus" ахоплівае сетку ключавых зьяваў, якія дазваляе вытлумачыць, – пачуцьце формы, стылю, густу. Так і ў паводзінах чалавека, занятага сэгрэгацыяй масы выраблянай сёньня вопраткі дзеля стварэньня свайго ўласнага індывідуальнага аблічча, дзейнічае, без сумневу, habitus. У дадзеным выпадку гэтае "практычнае веданьне" мае справу з значэньнямі мовы і канвэнцыямі, якія склаліся ў грамадзтве ў дачыненьні да вопраткі. Гэтая мова наўпрост зьвязаная з сэмантычным полем культуры, якое і спараджае пэўныя паняткі – "элегантнасьці", "фармальнасьці", "будзённасьці", "рамантычнасьці" і г.д. З гэтага гледзішча маніпуляцыя сваім выглядам, якую людзі зьдзяйсьняюць пры дапамозе вопраткі, дазваляе лёгка выявіць сувязь наноў сфармуляванага праз вопратку пасланьня з ідэалягічнымі рамкамі агульнага культурнага поля. Фармулёўка спэцыяльнага пасланьня – у тым ліку пры дапамозе вопраткі і вонкавага выгляду – зь неабходнасьцю зьвязана з пэўным рэлевантным сэмантычным кантэкстам, які, уласна, і робіць пасланьне даступным чытаньню і дэшыфраваньню. Пазбаўленыя свайго кантэксту і значэньня, прадметы туалету набываюць сэміятычную самастойнасьць, за якой можа адбывацца альбо поўны знакавы распад дрэс–коду, альбо ўзьнікненьне новай мовы, аніяк ня зьвязанай з сэміятычным мінулым. Гэтую залежнасьць пацьвярджаюць прыклады маніпуляцыі вопраткай, якія можна выявіць у моладзевых субкультурах пасьляваеннай Брытаніі. Найбольш вядомымі сярод іх былі групы "Тэдзі–бойз" і "Модз".

Свае "сацыяльныя праграмы" ўдзельнікі гэтых рухаў рэалізоўвалі праз вонкавы выгляд – праз спэцыфічнае выкарыстаньне стыляў, асобных прадметаў туалету. Акурат у спэцыяльна сфармаваны "выгляд" яны ўкладвалі сутнасьць сваіх грамадзкіх акцыяў. Вось жа, "Тэдзі–бойз" запазычылі ў вышэйшых слаёў так званае "Эдвардыянскае аблічча" і з асобных яго элемэнтаў стварылі ўласныя камбінацыі. Натуральна, што, выбіраючы сярод розных прадметаў туалету, яны, па сутнасьці, цікавіліся ня ўласна вопраткай, а тымі сацыяльна–сымбалічнымі канатацыямі, якія за ёй стаялі. Апранаючы рэчы, якія традыцыйна насілі арыстакратычныя дэндзі, яны нібы набывалі новы візуальна–сацыяльны статус. І выдаткоўвалі на гэта часьцяком усе свае сродкі: большасьць прадстаўнікоў "Тэдзі–бойз" належалі да калялюмпэнскіх, то бок бедных слаёў грамадзтва. "Яны фармавалі свой выгляд, запазычваючы асобныя дэталі з чужога слоўніка вопраткі і перапрацоўвалі іх ува ўласны, толькі ім уласьцівы стыль", – піша Тоні Джэфэрсан.

У іншую групу – "Модз" – уваходзілі пераважна лёнданскія падлеткі з рабочага асяродзьдзя, якія таксама імкнуліся аформіць і паказаць соцыюму сваю ідэнтычнасьць пры дапамозе характэрных фрызур і стылю вопраткі. "Яны літаральна прысьвячалі сябе вопратцы... пры гэтым стваралі асаблівыя камбінацыі з разрозьненых элемэнтаў і ператваралі сваё аблічча ў мэтафару", – пісаў ангельскі сацыёляг Дык Гебдыдж. Па сутнасьці, яны зьдзяйсьнялі інвэрсію каштоўнасьцяў, якія да іх асацыяваліся з добрай вопраткай – з пэўнай формай гальштукаў, кроем і матэрыялам нагавіц, колерамі кашуль. Гэтак яны кідалі выклік асновам, на якіх гэтыя каштоўнасьці трымаліся. "Іх ідэя была ў тым, каб падмануць чаканьні, зьдзейсьніць падмену таго зьместу, які звычайна стаяў за падобным выглядам", – піша Джэфэрсан.

Гэтыя своеасаблівыя брыкаляжы (*bricoleur*), якія брытанская моладзь стварала ў вопратцы, і ідэя, якую яны выказвалі, маглі існаваць толькі пры наяўнасьці асновасяжнай формы дыскурсу моды, якая служыла сэмантычным полем і ідэалягічнымі рамкамі для гэткіх дзеяньняў.

Іншымі словамі, каб быць асэнсаванымі і адэкватна зразумелымі, ідэям хлопчыкаў "Тэдзі" і "Модз" была неабходна сымбалічная падтрымка. Такой падтрымкай служылі агульнае сацыяльнае й сымбалічнае асяродзьдзе з уласьцівым яму дыскурсам, у якім прадметы туалету, аксэсуары ня проста існавалі, але і несьлі выразныя значэньні, арганізаваныя ў сыстэму. Прычым такая сыстэма мусіла быць настолькі трывалай, каб любое запазычаньне, перасоўваньне яе элемэнтаў у іншы кантэкст пакідала па сабе выразны знакавы сьлед, дазваляла прасачыць траекторыю – каб яна мела інфармацыю пра арыгінальных спажыўцоў, для якіх гэтыя прадметы выраблялiся. Гэтая інфармацыя ўваходзіла ў склад новага зьместу, які ўзьнік пасьля апрапрыяцыі. Можна сказаць, што паводзіны брытанскіх падлеткаў былі строга пазыцыянаваныя адносна тых, хто быў арыгінальным носьбітам гэтых прадметаў і іх стылёвай крыніцай, адносна агульнай сыстэмы значэньняў вопраткі і сацыяльных адносін.

Праблема пазыцыянаваньня зьяўляецца вызначальнай для адэкватнага разуменьня ідэй, выражаных у любых сацыяльных дзеяньнях, у тым ліку зьвязаных з маніпуляцыяй вопраткай. І акурат яна дапаможа разабрацца ў значэньні стыхійных брыкаляжаў на беларускіх вуліцах. У хаатычным, часта гранічна экспрэсіўным і спрошчаным стаўленьні да стылю, які мы тут назіраем, лёгка заўважыць фактычную абыякавасьць усіх гэтых мужчын і жанчын да ўласна мовы вопраткі. Прадметы туалету, аксэсуары, касмэтыка служаць інструмэнтарам, які адсылае, як і ў брытанскіх субкультурах, да сацыяльных адносін. Толькі тут гэтыя адносіны закранутыя ў іншым вымярэньні, што й ня дзіва, бо савецкі сацыялістычны досьвед праблематызуе зусім іншыя аспэкты сацыяльнага жыцьця. Вопратка для савецкіх людзей знаходзілася пад знакам праблематызацыі асабістай свабоды, на мяжы паміж грамадзкім і прыватным. Яна ж была адным з найбольш даступных шляхоў выхаду з–пад кантролю ідэалёгіі. Якраз у гэтай сфэры пазыцыянуецца зьмест выгляду людзей на беларускіх вуліцах. У ім адбываецца своеасаблівая рэарганізацыя адносін паміж целам і палітыкай яго публічнага выяўленьня, фактычна – рэвалюцыя ў асобна ўзятай сфэры сацыяльнага жыцьця. Так, нібыта вопратка стала першым адваяваным ува ўлады бастыёнам.

Яшчэ ў недалёкім мінулым сацыяльны досьвед гэтых людзей трымаўся на фундамэнтальным дэфіцыце ўласнасьці. Да мінімуму была зьведзеная практыка валоданьня, якую можна разглядаць як адну з асноўных формаў пашырэньня прасторы чалавечай кампэтэнцыі, што фармуе вонкавыя вэктары ягонай заклапочанасьці, інтарэсу і асабістай улучанасьці. Па сутнасьці, нястача пазытыўнага досьведу ўласьніцтва была характэрнай рысай усёй міталёгіі будзённага і сацыяльнага жыцьця таго ладу. Тады акурат чалавечае цела служыла апірышчам чалавечай прыватнасьці, было сымбалем той мяжы, за якую не заходзіла паноўная ў грамадзтве ўлада. Гэты прыватны статус цела не экспанаваўся, але й ня надта адмаўляўся ідэалёгіяй.

З таго часу шмат што зьмянілася. І хаця ў Беларусі не было сацыяльна–сыстэмных пераваротаў, зьмены закранулі асобныя сфэры грамадзкага жыцьця, сярод іх – вопратку. Скасаваньне ўніформы для дзяцей у агульнаадукацыйных установах было адным з знакаў такога сымбалічнага вызваленьня. Але той ранейшы досьвед, як ні дзіўна, і сёньня фармуе паводзіны беларусаў і беларусак.

Па сутнасьці, іх сучасны выгляд ня кажа пра багацьце ці галечу, дабрабыт ці ягоную нястачу. Ён ёсьць своеасаблівай дэкларацыяй – бачнай, яўнай, часам неапраўдана крыклівай – уласнага, асабістага статусу непадзельна належнага ім цела. Вопратка, адпаведна, зьяўляецца асноўнай мовай, пры дапамозе якой людзі адкрыта і публічна абвяшчаюць пра гэтае права. Цела падаецца соцыюму як толькі і выключна собскае, як бачны сымбаль "сябе", як тэрыторыя, дзе "раблю ўсё, што хачу", замест таго, каб быць, як раней, фізычнай матэрыяй, схаванай за шорамі сацыяльных ідэалягізмаў.

На першы погляд, такія публічныя паводзіны беларусаў здаюцца гранічна антысацыялістычнымі. Акцэнт на асабістым і індывідуальным, пастаўлены навідавоку ўва ўсіх, новая практыка дэманстратыўнага клопату аб целе пры дапамозе вопраткі і ягонае экспанаваньне ў грамадзкіх месцах зьяўляюцца нібыта адказам на ранейшыя і яшчэ не зусім забытыя забароны. Такім чынам, тая тэрыторыя, калісь акрэсьленая і цалкам падкантрольная сацыяльнай сыстэме рэпрэзэнтацыі, апынаецца ў мінулым. Аднак у сапраўднасьці эфэкт, які дасягаецца такімі паводзінамі і вопраткай, па сутнасьці, супрацьлеглы: яны дэманструюць гістарычную жывучасьць былога сацыялістычнага habitus–у.

Habitus можа разумецца ня толькі як простая асыміляцыя вонкавых правілаў у працэсе ўдзелу ў сацыяльным жыцьці, але і як унутраная інкалькуляцыя адпаведных дыспазыцыяў. Як такая, улучанасьць у агульны культурны і сацыяльны парадак дасягаецца праз уваходжаньне ў мноства прыватных дамінантна–падначаленых суадносін, якія ён задае. Адна з такіх дыспазыцыяў сацыяльнай прасторы ў эпоху сацыялізму закранала адносіны паміж прыватнай і грамадзкай сфэрамі. Чалавечае цела ў гэтай схеме пазначала сабой мяжу прыватнасьці. І тое, што мы назіраем сёньня ў беларускіх грамадзкіх месцах, – ці не ўвасабленьне гэта ў жыцьцё той старой знаёмай сацыялістычнай дыспазыцыі прыватнага і грамадзкага, якая, як бачым, захавалася і па–ранейшаму вызначае сацыяльныя паводзіны людзей? Здаецца, што яны рэвалюцыйна зьмяніліся, калі людзі пачалі апранаць ці занадта прывабную, ці адкрыта правакацыйную вопратку. Але за такім бачным бунтам праглядаецца стары добры чалавечы habitus эпохі сацыялізму, які ня зьнік з глыбіняў псыхалёгіі сацыяльнага суб'екта. І ў поўнай адпаведнасьці зь ім людзі па–ранейшаму застаюцца ўва ўладзе старой ідэалягемы, якая гаворыць ім, што цела – адзіная "асабістая справа" ў чалавечым жыцьці, яно ж – мяжа, якая акрэсьлівае рамкі "прыватнага" на грамадзкай, падкантрольнай усім уладам тэрыторыі.

Вена, 2003

---

[1] Советская Белоруссия. 2003. 24 лютага.

---

Published 2004–04–21
Original in Belarusian
Contribution by Arche
(c) Eurozine
(c) Arche